# Прамова тав. Крыніцкага.

У сваём прывітальным слове т. Крыніцкі зазначыў, што рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі выказваюць сваё спачуваньне прыгнечаным працоўным масам Заходняй Беларусі. Наша шчыльная сувязь з імі ніколі не аслабее.

— За апошнія гады,—заявіў далей тав. Крыніцкі,—як ніколі ўзмацавалася сувязь паміж камуністычнай партыяй і рабочымі і сялянамі. Перавыбары саветаў Беларусі былі праверкай сувязі партыі з працоўнымі масамі.

Пераходзячы да нашага дзяржаўнага будаўніцтва тав. Крыніцкі спыніўся на дасягненьнях у гэтай галіне: мы маем посьпехі у галіне ўзмацненьня каапэрацыі, адбудовы гаспадаркі, культурнага будаўніцтва і вырашэньня нацыянальнага пытаньня.

— Правільнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня,—кажа т. Крыніцкі,—зьяўляецца адной з галоўных задач камуністычнай партыі. Мы павінны разьвіваць беларускую культуру і актыўна праводзіць беларусізацыю апарату. Што наша палітыка правідловая, сьведчыць тое, што па дакладу ураду БССР сэсія ЦВК СССР адобрыла нашу працу.

* * *